дэнсаваным зместам без адцягненых разважанняў, адарваных ад зямлі. І нават размоўная інтанацыя не замінае верлібрам з аднаго-двух сказаў гучаць афарыстычна: «Кажуць: зло / Нараджае зло. / А найчасцей – / Яго нараджае / Надзея / На адпушчэнне / Грахоў» [6, с. 867].

Паказальна, што верлібры-«інсайты» сталі больш прыкметнай з'явай менавіта сталага перыяду творчасці Максіма Танка. Паэт дзеліцца зернем свайго духоўнага вопыту, не марнуючы час на празмерныя разважанні і доказы там, дзе азарэнне паэта гаворыць самое за сябе. У лаканічных верлібрах з кнігі «Мой каўчэг» арганічна спалучаюцца афарыстычнасць і спавядальнаць, шматузроўневая асацыятыўнасць і неадрыўная сувязь з прозай жыцця, размоўнасць інтанацыі і пераканаўчасць мудрага настаўніка.

Літаратура

1. Верына, У. Ю. Верлібр у паэзіі беларускага авангарду 1980–1990-х гадоў / У. Ю. Верына. – Мінск : Бестпрынт, 2005. – 91 с.
2. Гніламёдаў, У. В. Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларус. паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 246 с.
3. Кабаковіч, А. К. Беларускі свабодны верш / А. К. Кабаковіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 175 с.
4. Мішчанчук, М. І. Стыль Максіма Танка: кантэкстуальны аспект / М. І. Мішчанчук // Сёмыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. Ф. С. Шумчык [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 121–123.
5. Рагойша, В. П. Беларускае вершаванне : вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў па філалаг. спец. / В. П. Рагойша. – Мінск : БДУ, 2010. – 150 с.
6. Танк, М. Збор твораў / М. Танк. – Мінск : Харвест, 2010. – 1007 с.
7. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Т. 10 : Дзённікі (1960–1994). – 919 с.

В. А. Мусіенка (Беларусь)

ДРУГАСНЫЯ КАНСІСТЭНТНЫЯ НАМІНАЦЫІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АД'ЕКТЫВАЎ БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОЎ)

Кансістэнтныя намінацыі выконваюць важную ролю ў слоўнікавым складзе любой мовы. Асноўным сродкам рэпрэзентацыі катэгорыі «кансістэнтнасць» з'яўляюцца прыметнікі, які ўказваюць на гушчыню (рухомасць), ступень шчыльнасці, цвёрдасці, мацунку глейкіх вадкасцяў і паўцвёрдых рэчываў (паст, мазяў, цеста, бітумаў і т. п.). У беларускай і англійскай мовах налічваюцца звыш дваццаці такіх лексічных адзінак. З іх не ўтварылі другасных ментальных ЛСВ пяць карэлятыўных пар (*вязкі – viscid, густы – thick, клейкі – sticky, глейкі – glutinous, жыдкі – liquid*). У асобных выпадках назіраецца парушэнне карэлятыўнасці і адсутнасць у колькасці лексічных адпаведнікаў. Так, для англійскага *soft* ужываюцца тры прыметнікі *мяккі, мяккацелы, цвёрды* і наадварот, для беларускага *жорсткі – hard, tough* і для беларускага *каляны – rigid, stiff.*

Найбольш пашыраная структура назіраецца ў прыметніка *цвёрды* 'які характарызуецца стабільнасцю формы, з цяжкасцю паддаецца сціскацню, згінанню; грубы, жорсткі'. Семантычная парадыгма гэтага прыметніка ўключае 4 другасных ЛСВ 'стойкі ў сваіх перакананнях, намерах; непахісны, стойкі' (*цвёрды характар, цвёрдая воля*), 'устойлівы, трывалы, не хісткі' (*цвёрдая ўлада*), 'канчатковы, беспаваротны; без хістанняў' (*цвёрды намер, цвёрдае рашэнне, цвёрдая ўпэўненасць*), 'добра засвоены, трывалы, грунтоўны' (*цвёрдыя веды*), 'трывалы, надзейны; без парушэнняў' (*цвёрдая дысцыпліна,*

цвёрдае абяцанне). У англійскім адпаведніку *solid* зафіксавана тры другасных ЛСВ ‘dependable; reliable’ ‘надзейны’ (*the defence is* ***solid*** *– абарона цвёрдая, there is* ***solid evidence*** *of lower inflation – ёсць цвёрдыя доказы зніжэння інфляцыі*), ‘sound but without any special qualities or flair’ ‘моцны, але без асаблівых якасцяў і арыгінальнасці’ (*the rest of the acting is* ***solid*** *– астатняе акцёрскае майстэрства – цвёрдае*), ‘severe; unfair’ ‘суровы, несправядлівы’ (*they'll be* ***solid*** *on him for that mistake – яны будуць цвёрдымі з ім за тую памылку*).

У суадноснай пары *зацвярдзелы – hardened* другасныя ЛСВ развіліся толькі ў англійскім прыметніку ‘very experienced in a particular job or activity and therefore not easily upset by its more unpleasant aspects’ ‘вельмі дасведчаны ў пэўнай працы або дзейнасці, і таму яго няпроста засмуціць больш непрыемнымі аспектамі’ (***hardened police officers*** *– зацвярдзелыя супрацоўнікі міліцыі, а* ***battle-hardened veteran*** *– зацвярдзелы ў баях ветэран*, ***hardened criminals*** *– зацвярдзелыя злачынцы, а* ***hardened liar –*** *зацвярдзелы хлус*).

Для беларускага прыметніка *жорсткі* маюцца два англійскія адпаведнікі *hard, tough*. Гэтая група характарызуецца шырокай семантычнай парадыгмай. Агульным для дзвюх моў з’яўляюцца негатыўны ЛСВ ‘строгі, які не дапускае адхіленняў’ (*жорсткія ўмовы, жорсткі рэжым*), ‘demonstrating a strict and uncompromising approach’ ‘які дэманструе строгі і бескампрамісны падыход’ (*police have been getting* ***tough*** *with drivers – міліцыя становіцца ўсё больш жорсткай з кіроўцамі,* ***tough new laws*** *on tobacco advertising – жорсткія новыя законы аб рэкламе тытуню*). Спецыфічнымі для беларускай мовы з’яўляюцца другасныя ЛСВ ‘крайне суровы; бязлітасны, неміласэрны’ (*жорсткі падлетак, жорсткія вочы, жорсткія рысы твару, жорсткае жыццё, жорсткія часы*), ‘які перавышае звычайную меру, ступень, вельмі моцны па сіле праяўлення’ (*жорсткі прыгнёт, жорсткія баі*), ‘суровы, рэзкі’ (*жорсткі характар, жорсткія словы*). *У вачах Марціна бліснулі жорсткія агеньчыкі* (І. Мележ). Толькі ў англійскай мове развіліся ЛСВ ‘not showing any signs of weakness; tough’ ‘які не праяўляе прыкмет слабасці; жорсткі’ (*only a handful are* ***hard*** *enough to join the SAS – толькі тыя нешматлікія і дастаткова жорсткія прэтэндэнты здольныя для таго, каб уступіць у кампанію SAS*), ‘requiring a great deal of endurance or effort’ ‘які патрабуе вялікай вытрымкі і намаганняў’ (***hard work*** *– жорсткая праца,* ***hard worker*** *– жорсткі працаўнік,* ***hard life*** *– жорсткае жыццё,* ***hard times*** *– жорсткія часы,* ***hard question*** *– жорсткае пытанне,* ***hard taskmaster*** *– жорсткі кіраўнік задання, the* ***hard left*** *– жорсткі левы = які цвёрда стаіць на пазіцыях левых*), ‘(of information) reliable, especially because based on something true or substantiated’ ‘надзейны, асабліва таму, што заснаваны на нечым праўдзівым альбо абгрунтаваным (пра інфармацыю)’ (***hard facts*** *– жорсткія факты,* ***hard science*** *– жорсткая навука, а* ***hard novel*** *– жорсткі раман*), ‘very potent, powerful, or intense, in particular’ ‘асабліва магутны або інтэнсіўны’ (***hard drinker*** *– жорсткі алкаголік,* ***hard drugs*** *– жорсткія наркотыкі,* ***hard porno*** *– жорсткае порна*), ‘able to endure hardship or pain’ ‘здольны пераносіць цяжкасці або боль’ (*tough person – жорсткі чалавек, tough matches – жорсткія матчы*), ‘strong and prone to violence’ ‘моцны і схільны да гвалту’ (***tough young teenagers –*** *жорсткія маладыя падлеткі*).

Для беларускага *каляны* ў англійскай мове ўжываюцца два адпаведнікі *rigid, stiff*. Калі ў беларускім прыметніку другасныя ЛСВ не ўтвараюцца, то ў англійскіх ад’ектывах гэтыя словы выкарысталі здольнасць да семантычнай дэрывацыі і ўтварылі тры другасныя ЛСВ ‘not able to be changed or adapted’ ‘які не можа быць зменены або адаптаваны’ (***rigid bureaucratic controls –*** *каляны бюракратычны кантроль, the College had not wanted to be too* ***rigid*** *in imposing teaching methods – каледж не хацеў быць занадта жорсткім у навязванні*

метадаў навучання), ‘(of a person or their manner) not relaxed or friendly; constrained’ ‘не расслаблены і не прыязны; абмежаваны (пра чалавека ці яго манеры)’ (*she greeted him with* ***stiff politeness*** *– яна сустрэла яго з калянай ветлівасцю*), ‘severe or strong’ ‘суровы або моцны’ (*they face* ***stiff fines*** *and a possible jail sentence – ім пагражае каляны штраф і магчымае пазбаўленне волі, а* ***stiff increase*** *in taxes – калянае павелічэнне падаткаў*).

Практычна не назіраецца поўных семантычных супадзенняў у другасных ЛСВ ад’ектыўнай пары *шчыльны – dense*. Толькі ў беларускай мове актуалізуюцца ЛСВ ‘дасканалы, плённы, прадукцыйны’: *Дадатковая электраэнергія можа быць выпрацавана на гідраэлектрастанцыях без устаноўкі новых магутнасцей. У гэтым выпадку толькі больш шчыльным стане рэжым іх работы* («Звязда»), ‘насычаны, напоўнены якімі-н. падзеямі, мерапрыемствамі і пад.’: *У летнія месяцы спартыўны каляндар бывае асабліва шчыльным* («Беларусь»), ‘хуткі, безупынны’: *– А дзе ён сёння, Сцяпан Антонавіч? – улучае хвіліну, каб утачыцца ў шчыльную Марыніну гаворку, Зіна*. (В. Палтаран), ‘моцна звязаны, з'яднаны агульнымі інтарэсамі, мэтамі, задачамі і пад.’: *Узаемная прыязнь,.. загартаваная выпрабаваннямі ў агні, стварала шчыльную баявую сям'ю* (Я. Брыль). Другасныя ЛСВ англійскага *dense* арыентаваны на выражэнне ментальных здольнасцяў чалавека і даволі складаных, цяжка зразумелых ідэй, думак, выказванняў ‘(of a person) stupid’ ‘тупы (пра чалавека)’ (***a dense man*** *– тупы чалавек*), ‘hard to understand because of its complexity of ideas’ ‘які цяжка зразумець з-за складанасці ідэй’ (***dense text*** *– шчыльны тэкст*).

Блізкія, але няпоўныя семантычныя супадзенні назіраюцца ў другасных ЛСВ прыметнікаў *моцны – firm* ‘глыбокі, вялікі (аб пачуццях, перажываннях і пад.)’ (*моцнае ўражанне, моцнае пачуццё, моцнае ўзрушэнне*), ‘strongly felt and unlikely to change’ ‘які моцна адчуваецца і наўрад ці зменіцца’ (*he retains a* ***firm belief*** *in the efficacy of prayer – ён захоўвае моцную веру ў эфектыўнасць малітвы*).

У выніковай паняційнай сферы беларускага прыметніка *чэрствы* актуалізуецца ЛСВ ‘нячулы, бяздушны’: *І пэўна не скажа патомкам Радзіма, / Што з чэрствай душою прыйшоў я на свет* (Н. Гілевіч). У англійскім адпаведніку *stale* выяўлены ЛСВ іншай семантычнай сферы ‘something that is stale has been said or done too many times before and is no longer interesting or exciting’ ‘які больш нецікавы або незахапляльны’ (***stale jokes*** *– чэрствыя жарты, Their marriage had gone* ***stale****. – Іх шлюб стаў чэрствым*), ‘a person who is stale has done the same thing for too long and so is unable to do it well or produce any new ideas’ ‘які больш не здольны ствараць новыя ідэі’ (*After ten years in the job, she left* ***stale*** *and needed a change. – Пасля дзесяці год працы на гэтай рабоце, яна стала адчуваць сябе чэрствай і захацела зменаў*).

У суадноснай пары прыметнікаў *цягучы – viscous* здольнасць да семантычнай дэрывацыі выяўлена толькі ў беларускім адпаведніку ‘працяглы, запаволены, марудлівы’: *Песні былі ягадныя, старадаўнія, доўгія-доўгія і цягучыя-цягучыя…* (Б. Сачанка), ‘стамляюча доўгі, аднастайны’: *Мокры цягучы дзень нарэшце схіліўся к вечару* (А. Кулакоўскі), ‘цягавітыя’: *Працаваў так, што аж сам здзівіўся, які ён цягучы і дужы* (А. Чарнышэвіч); *Капаем мы акоп, капаем удвух. Абодва цягучыя. І выкапалі мы ўжо метры два ў глыбіню* (У. Дубоўка).

У суадносных парах *рэдкі – thin, ліпкі – adhesive* другасныя ЛСВ развіліся толькі ў беларускіх адпаведніках ‘выдатны, выключны па сваіх якасцях’ (*рэдкі чалавек*), ‘неадчэпны, назойлівы’ (*ліпкі позірк, ліпкія словы*).

Для англійскага прыметніка *soft* у беларускай мове зафіксаваны тры адпаведнікі, якія характарызуюцца даволі шырокай сэнсавай структурай: *мяккі, мяккацелы, няцвёрды*. Толькі ў беларускай мове ўтварыліся ЛСВ ‘які лёгка паддаецца чужому ўплыву; хісткі, няўстойлівы’ (*мяккі таварыш, мяккі і душэўны*

чалавек, мяккая натура, мяккія словы), ‘нястрогі, паблажлівы; процілеглае суровы’ (*мяккі прыгавор, мяккае абыходжанне*), ‘пазбаўлены рэзкасці, грубасці; далікатны’: *У голасе разам з мяккім дакорам чулася зморанасць* (В. Гарбук). *Мяккі тон маёра адразу раззброіў Пальчыка* (У. Дамашэвіч), ‘які лёгка паддаецца чужому ўплыву; бязвольны, бесхарактарны’: *Ганскі адчуваў некаторую палёгку ад таго, што з яго спалі абавязкі члена сельсавета, якія яго, нерашучага і мяккацелага, заўсёды трохі прыгняталі* (К. Крапіва), ‘няўпэўнены, хісткі’: *Наталля Пятроўна ў жаху адхіснулася і няцвёрдым крокам выйшла з хаты.* (І. Шамякін). *»Дарагая, любая мамачка», – пісала яшчэ няцвёрдая, але старанная дзіцячая рука* (К. Кірэенка), ‘такі, якому не ўласціва рашучасць, цвёрдасць’ (*няцвёрды характар, няцвёрды адказ*). У англійскім прыметніку *soft* назіраецца крыху меншая семантычная парадыгма і яе іншая сэнсавая напоўненасць: ‘weak and lacking courage’ ‘які слабы і якому не хапае мужнасці’ (***soft southerners** – мяккія паўднёўцы*), ‘sympathetic, lenient, or compassionate, especially to a degree perceived as excessive; not strict or sufficiently strict’ ‘спагадлівы, мяккі, асабліва ў ступені, які ўспрымаецца як празмерны; не строгі або недастаткова строгі’ (*the government is not becoming **soft** on crime – урад не становіцца мяккім да злачынстваў, Julia's **soft heart** was touched by his grief – мяккае сэрца Джуліі было кранута яго горам, he was no good with **soft words**, gentle phrases – у яго не атрымлівадася выказвацца мяккімі словамі, пяшчотнымі фразамі, candidates ranging from far right to **soft left** – кандыдаты, якія вар’іруюцца ад крайніх правых да мяккіх левых*).

Такім чынам, у беларускай і англійскай мовах шырока ўжываюцца кансістэнтныя ад’ектывы, якія ўтвараюць розныя па семантычным складзе структуры. Экспансія другасных ЛСВ кансістэнтных прыметнікаў распаўсюджваецца на сферу жыццядзейнасці чалавека, яго знешняга выгляду, ментальных уласцівасцяў, эмацыянальнагу стану (*цвёрды – solid, рэдкі – thin, мяккі – soft, моцны – firm, друзлы – loose, гнілы – rotten, каламутны – muddy*), а таксама сферу міжасобасных і сацыяльных адносін (*цвёрды – solid, мяккі – soft, жорсткі – hard*). У залежнасці ад суадносін семантыкі ў эквівалентных адзінках беларускай і англійскай моў вылучаюцца тры асноўныя тыпы апазіцыі: тоеснасці, уключэння і несупадзення. Тоесныя другасныя ЛСВ сустракаюцца ў дзвюх суадносных парах (*жорсткі – hard, tough* і *моцны – firm*). Англійскім монасімічным прыметнікам *thin, adhesive і viscous* у беларускай мове адпавядаюць полісемантычныя адпаведнікі *рэдкі, ліпкі і цягучы*. Семантычнае несупадзенне назіраецца і ў колькасным складзе семантычных парадыгмаў. Так, семантычная парадыгма для англійскага *hard, tough* уключае восем ЛСВ (у беларускай – пяць). Для суадносін уключэння можна вылучыць пару *моцны – firm*, дзе англійскі адпаведнік мае частковае адценне ад беларускага ЛСВ і наадварот.

Г. В. Навасельцава (Беларусь)

НАВЕЛІСТЫЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ РАМАНЕ

У некласічным, у прыватнасці, постмадэрнісцкім рамане асоба застаецца прадметам мастацкага даследавання, аднак асэнсоўваецца пісьменнікам не столькі ва ўзаемастасунках з грамадствам, колькі адасоблена ад акаляючага свету, у выніку чаго ўзнікае новы тып адносін паміж аўтарам і персанажам. У прыватнасці, вядзецца прамая размова пісьменніка пра сябе і свае адносіны да свету – выяўляецца аўтарскае «я». Мастак слова такім чынам імкнецца вырашыць праблему героя, выступае ў цэнтры аповеду, які ў нейкай ступені